С. Г. КАНАНОВІЧ
Пінск, ДУА «СШ № 17 г. Пінска»

ВЫКАРЫСТАННЕ ПЕДАГАГІЧНЫХ СРОДКАЎ І СПОСАБАЎ ПАВЫШЭННЯ МАТЫВАЦЫІ ВУЧНЯЎ ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАЎ ДА ВЫВУЧЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ.

Па дадзеных ЮНЕСКА, у свеце існуе больш за шэсць тысяч моў і палова іх знаходзіцца на мяжы вымірання. Тысячы моў не выкарыстоўваюцца ў сістэме адукацыі і не прадстаўлены ў інтэрнэце. З кожным годам іх колькасць памяншаецца. Яшчэ нядаўна налічвалася да васьмі тысяч самастойных моў, сёння іх на дзве тысячы менш. Беларуская мова таксама лічыцца выміраючай.

Мова – душа народа, векавая праца многіх пакаленняў, люстэрка духоўнага жыцця і творчасці грамадства, наш галоўны і неацэнны скарб. І сёння гонар і абавязак усіх нас – шанаваць родную мову, садзейнічаць яе развіццю і росквіту.

Гістарычны шлях Беларусі склаўся так, што працяглы час нашы землі знаходзіліся пад уладай больш магутных суседніх дзяржаў – Польшчы і Расіі. І кожная з іх імкнулася сцерці адметныя рысы беларусаў, каб далучыць іх да свайго народа. Найперш удар прыходзіўся па мове – найбольш яскравай прыкмеце беларусаў. Стагоддзі мясцовы люд адвучалі гаварыць па-беларуску, але мова жыла. І сёння яна з’яўляецца адной з дзяржаўных у нашай краіне. Гэта мова навукі, культуры, асветы. Паводле перапісу насельніцтва беларускую мову назвалі роднай 5 мільёнаў 58 тысяч грамадзян Беларусі, што складае каля 60%. Па-беларуску дома размаўляюць 23% беларусаў, 18% школьнікаў вывучаюць усе прадметы на беларускай мове. Прыгажосць і мілагучнасць нашай мовы, хараство яе гучання не аспрэчваецца нават тымі, хто ніколі яе не вывучаў.

Але ў паўсядзённым жыцці часцей мы чуем рускую мову.

Дзеці майго класа не размаўляюць дома з бацькамі на беларускай мове. Толькі ўнекаторых выпадках пры размове ўжываюць беларускія словы.

Нажаль, вельмі малая частка насельніцтва добра валодае вуснай і пісьмовай роднай мовай.

Для большасці дзяцей нашай краіны першай мовай, якую яны чуюць ад бацькоў, з’яўляецца руская.

Родная мова з усімі трапнымі выразамі, каларытам не становіцца мовай дзіцячага маўлення. Як паказвае практыка, асноўныя цяжкасці ў пазнанні роднай мовы звязаны з недастатковасцю лексічнага запасу

дзяцей. Дзеці прыходзяць у школу з даволі нізкім узроўнем слоўнікавага запасу, адсутнасцю камунікатыўнага вопыту на роднай мове.

Пагэтаму, я лічу, што перад настаўнікам пачатковых класаў стаіць задача-- павысіць матывацыю вучняў да вывучэння беларускай мовы.

Па меркаваннях псіхолагаў, рэзультат дзейнасці чалавека на 10-20% залежыць ад інтэлектуі на 70-80% ад матываў.

Асноўная задача настаўніка — імкненне да поспеху, усімі сродкамі заахвочваць нават самае маленькае дасягненне, не акцэнтаваць увагу на няўдачах.

У псіхолага-педагагічнай літаратуры ёсць цэлы пералік распрацаваных спосабаў павышэння ўнутранай матывацыі ў навучальным працэсе:

1) не навязваць школьніку сваіх вучэбных мэт “зверху”. А калі раптам яны пастаўлены, то павінны быць зразумелымі і ўнутрана прынятымі вучнем – набыць значнасць для яго асобы. Менавіта сумесная работа па вызначэнні мэт і задач стане больш эфектыўнай у навучальным працэсе. Мэта настаўніка павінна зрабіцца мэтаю вучня ;

2) за правільныя адказы і выкананыя заданні ўзнагароджваць вучня толькі добрым словам, пахвалою;

3) ніколі не крытыкаваць за няўдачу і не прыніжаць годнасць вучня;

4) як мага часцей выкарыстоўваць гульнёвыя формы дзейнасці, а не спаборніцтва ;

5) вучэбныя заданні да ўрока пажадана падбіраць з элементамі навізны;

6) з кожным наступным урокам рэгуляваць узровень заданняў па складанасці і цяжкасці ;

7) у час сумеснай працы абавязкова даваць вучням права выбару і г.д.

На сваіх вучэбных занятках беларускай мовы, пачынаючы з першага класа , значнае месца адводжу практыкаванням , накіраваным на актывізацыю слоўніка дзяцей, выпрацоўку ўмення выбіраць патрэбнае слова для выказвання сваёй думкі. Для гэтага выкарыстоўваю малюнкавы слоўнік, які дапамагае дзецям засвоіць больш слоў на беларускай мове. Для замацавання ведаў праводжу гульні “Дапамажы жывелам”, “Пакупкі”, “Птушкі ля кармушкі”, у якіх прапаную вучням падабраць да малюнкаў подпісы.

Дзеці малодшага школьнага ўзросту асабліва ўспрымальныя да засваення мовы. Яны лёгка могуць запамінаць новыя словы і выразы. Садзейнічаюць гэтаму разнастайныя формы работы над прыказкамі, прымаўкамі, чыстагаворкамі, скорагаворкамі, фразеалагізмамі, якія

пашыраюць лексічны запас малодшых школьнікаў, знаёмяць з багатай фальклорнай спадчынай беларускага народа, спрыяюць развіццю фанематычнага слыху, засваенню арфаэпічнага правільнага вымаўлення.

Пры правядзенні хвілінак чыстапісання на вучэбных занятках беларускай мовы выкарыстоўваю народныя выслоўі, прыкметы, абапіраюся на беларускі народны каляндар.У верасні знаёмлю дзяцей са святам Багач, у кастрычніку – Пакрова, у лістападзе – Дзяды, у снежні – Увядзенне, у студзені – Каляды, у лютым – Масленіца, у сакавіку – Саракі, у красавіку – Благавешчанне, у маі – Вялікдзень.

Эфектыўнай формай работы з'яўляецца падбор прыказак, прымавак і фразеалагізмаў да прадметнага ці сюжэтнага малюнка. Вучні разглядаюць ілюстрацыю і стараюцца ўспомніць як мага больш прыказак, у якіх узгадваюцца адлюстраваныя прадметы. Напрыклад:паказваю дзецям малюнак ластаўкі і прапаную ўспомніць прыказкі, прыкметы пра ластаўку.

Адна ластаўка вясны не робіць.

Ластаўка прыляцела – сонца зямлю абагрэла.

Ластаўкі лётаюць нізка – будзе дождж.

Прыказкі і прымаўкі выкарыстоўваю пры правядзенні гульні "Аднаві прыказку", "Збяры прыказку", "Закончы прыказку", "Знайдзі прыказку ў тэксце".Так, на дошцы запісваецца любое (першае, апошняе) слова прыказкі, вучням прапануецца ўспомніць усю прыказку ці прымаўку. Калі заданне выклікае цяжкасці, то адкрываецца па чарзе наступнае (ці папярэдняе слова). Так вучні спрабуюць аднавіць выраз.

Яшчэ аднымз варыянтаў работы, з'яўляецца той, калі дзеці ўзгадваюць прыказку па двух словах. Напрыклад:

птушка – дзіця

Птушка рада вясне, а дзіця — маці.

галава – ногі

Ад дурной галавы і нагам неспакой.

Таксама развіваць лексічны запас вучняўдапамагаюць наступныя віды работ:

- раскрыццё сэнсу прыказак, прымавак, фразеалагізмаў.
- складанне міні-апавяданняў па прыказцы (дыялогі).

Беларускі фальклор мае вялікі выхаваўчы патэнцыял, што спрыяе фарміраванню і развіццю ў вучняў маральных якасцей: патрыятызму, дабрыні, цярплівасці, клопату пра сябра. Сістэматычная работа з прыказкамі і прымаўкамі на кожным уроку знімае напружаннасць, стомленнасць дзяцей, служыць своеасаблівай фізкультхвілінкай. Кожны імкнецца ўспомніць больш прыказак.

Абапіраючыся на зрокавую памяць, на ўроках беларускай мовы выкарыстоўваю гульні з прадметнымі малюнкамі “Назаві па-беларуску”, “Дзе мы выкарыстоўваем дадзены прадмет?”, “Апішы прадмет”.

З мэтай актывізацыі разумовай дзейнасці і ўзбагачэння слоўнікавага запасу на вучэбных занятках беларускай мовы выкарыстоўваюнаступныя гульнёвыя практыкаванні:

1. “Зборшчыкі”: аднавіце рассыпаныя словы, што знаходзяцца ў правым і левым слупках.
2. “Чацвертае лішняе”: сярод прапанаваных слоў адшукайце і падкрэсліце лішняе.
3. “Карэктары”: выправіце памылкі ў запісаных словах.
4. “Перакладчыкі”: перакладзіце словы з рускай мовы на беларускую.
5. “Словы рассыпаліся”: складзіце словы з прапанаваных літар і запішыце.

Прымяненне разнастайных навучальных матэрыялаў і прыёмаў вучэбнай работы спрыяе павышэнню цікавасці да прадмета.

Найбольш эфектыўным метадам навучання для развіцця матывацыі з'яўляецца праблемнае навучанне, пры якім веды вучням не даюцца ў гатовым выглядзе, а набываюцца толькі ў працэсе вырашэння прабленай сітуацыі. Самае важнае пры гэтым- развіваць у вучняў пошукавы стыль мыслення, прывіваць цікавасць да самастойнага рашэння праблемы.

Найчасцей праблемныя сітуацыі выкарыстоўваю на этапе знаёмства і вывучэння новай тэмы.

Напрыклад, пры вывучэнні тэмы “Перанос слоў” у 2 класе задаю пытанне:

- Што вы будзеце рабіць, калі пачалі пісаць слова, а месца на радку не хапае?
- Спішыце з дошкі словы асіна, ясень, акацыя, клён, бяроза і падзяліце іх для пераносу.
- Чаму, выконваючы аднолькавае заданне, атрымаліся розныя адказы?
- Вашы меркаванні, як можна падзяліць слова для пераносу?
- Давайце вызначым тэму нашага ўрока.

У сваім класе часта выкарыстоўваю наступныя формы павышэння матывацыі ў вучняў:

1. Групавая форма работы. У многіх выпадках групавая форма вучэбнай дзейнасці стварае лепшую матывацыю, чым індывідуальная. Групавая форма “ўцягвае” ў актыўную работу нават пасіўных, слабаматы-ваныхвучняў.Падсвядомаўзнікае ўстаноўка на спаборніцтва, жаданне быць не горшым за другіх.

2. Прыцягненневучняў да адзнакавай дзейнасці (узаемаправерка сшыткаў).

3. Незвычайная форма навучання (урокі з выкарыстаннем ралявых гульняў): “У магазіне”, “Звары суп”, “Збяры букет” і інш.

Пры правядзенні рэфлексіі выкарыстоўваю наступныя прыёмы:

- “Аўтар”

“ Калі б вы былі аўтарам падручніка, як бы вы растлумачылі вучням неабходнасць вывучэння гэтай тэмы?”

- “Фантазёр”

Назавіце 5 спосабаў выкарыстанне ведаў уменняў і навыкаў па гэтай тэме ў жыцці.

- “Прафесіянал”

Зыходзячы з будучай прафесіі, раскажыце, для чаго спатрэбяцца веды па гэтай тэме.

Немалаважна ўсведамленневучнямі сваіх поспехаў — рухунаперад. Для гэтагавыкарыстоўваю наступныя прыёмы прагназавання:

1. Якую адзнаку ты жадаў бы мець па прадмеце за чвэрць?
2. Што ты павінен зрабіць, каб гэта адбылося?
3. Чыя дапамога табе патрэбна?
4. Што можа здарыцца, калі ты будзеш пісаць без памылак?

Важную ролю ў павышэнні матывацыі вучняў адыгрывае ўзаемадзеянне з бацькамі, якія могуць дапамагчы ў фарміраванні станоўчага настрою на вучобу.

На бацькоўскіх сходах і ў індывідуальных гутарках прапаную бацькам дома больш размаўляць з дзецьмі па-беларуску. Ужываць у размовах ветлівыя словы “дзякуй”, “калі ласка”, “добрай раніцы” і інш. Чытаць больш кніг на роднай мове.

Мэтанакіраваная праца па фарміраванні вучэбнай матывацыі выхоўвае асабістыя якасці вучняў, дапамагае павысіць пазнавальную актыўнасць, вядзе да росту якасці ведаў, дазваляе павысіць узровень навучання.

У пошуку аптымальнага і універсальнага спосабу для вырашэння дадзенай праблемы я выкарыстоўваю займальны матэрыял, таму што ён асабліва важны для прыцягнення ўвагі дзяцей на ўроку.

Выкарыстанне займальнага матэрыялу спрыяе павышэнню матывацыі вучняў:

- навучальны матэрыял засвойваецца з радасцю і задавальненнем.
- веды становяцца каштоўнымі для вучня, ён імкнецца да іх далейшага набыцця.
- пашыраецца кругагляд, развіваецца фантазія.

- у дзяцей фарміруецца любоў да працы, вучэбных заняткаў, чытання кніг, здабывання ведаў.

Увесь займальны матэрыял, які выкарыстоўваецца мной, я класіфікавала наступным чынам.



Для стварэння станоўчай псіхалагічнай атмасферы ўрока і настрою дзяцей на працоўны лад, я з поспехам выкарыстоўваю вершы. Вось адзін з іх.

Празваніў і змоўкзванок.
Пачынаецца урок.
Мы за парты дружнаселі
І на дошкупаглядзелі

Таксамавыкарыстоўваювершы для апісаннятыхабоіншыхиллюстрацый, а таксамалітар.

Літара Ц
Нямалалітар мы пазналі,
І дабраліся да Ц.
Ёсцьсловы, дзеЦ – у пачатку,
Ёсцьсловы, дзеЦ – у канцы.

Бусел
Выйшаўбуселпагуляць,

З`еўрапухаўдваццацьпяць,
Дваццацьпяцьцідваццацьшэсць?
Збіўся з ліку і не есць,
На аднойпрыстаўназе
І на пальцах ліквядзе.
Ды як злічыш?
У ягоВосемпальцаўусяго*(М.Танк)*

Ажывіць ўрок, павысіць яго пазнавальнае значэнне, можна пры дапамозе выкарыстання на вучэбных занятках прыказак, прымавак, фразеалагізмаў, казак, загадак, інсцэніровак. Дзецівельмілюбяцьрозныязагадкі. Адгадвацьзагадкінетольківесела, алеікарысна – развіваеццафантазія,кемлівасць, розум. Напрыкладпрывывучэннітэмы “Зычныягукі [в] [в'], літары В, в мною былі выкарыстаны наступныя загадкі.

Грыбкоў сабе насушыць, арэшкаў назбірае,
Зіма сняжком цярушыць, а ёй — бяда малая. (Вавёрка.)

Чырвонае цельца,
Каменнаесэрца,
Вінная на смак,
А завецца як? (Вішня)

Падсоснамі, падёлкаміляжыць клубок з іголкамі. (Вожык)

Акрамягэтага, на вучэбныхзанятках беларускай мовы, я выкарыстоўваюрэбусы. Напярэднізнаёмлюдзяцей з правіламііхразгадвання.Рэбусразвіваелагічна-вобразнаемысленне, вучыцьшкольніка нестандартна ўспрымацьграфічнаявыявы, а таксаматрэніруезрокавуюпамяць і правапіс. Зразумеўшырэбус,дзецідаведаюццапракагоабопрашто мы будземгаварыць на ўроку.





Прыказкі і прымаўкі - люстэрка народнай мудрасці. Знаёмства з прыказкамі і прымаўкамі на ўрокахбеларускаймовывучыцьдзяцейвы-казваць свае думківобразна і выразна, ўзбагачаеіхслоўнікавы запас.

Эфектыўнай формай работы з'яўляецца падбор прыказак, прымавак і фразеалагізмаў да прадметнага ці сюжэтнага малюнка.

Вучні разглядаюць ілюстрацыю і стараюцца ўспомніць як мага больш прыказак, у якіх узгадваюцца адлюстраваныя прадметы. Напрыклад: паказваю дзецям малюнак ластаўкі і прапаную ўспомніць прыказкі, прыкметы пра ластаўку.

Адна ластаўка вясны не робіць.

Ластаўка прыляцела – сонца зямлю абагрэла.

Ластаўкі лётаюць нізка – будзе дождж.

Прыказкі і прымаўкі выкарыстоўваю пры правядзенні гульні "Аднаві прыказку", "Збяры прыказку", "Закончы прыказку", "Знайдзі прыказку ў тэксце". Так на дошцы запісваецца любое (першае, апошняе) слова прыказкі, вучням прапануецца ўспомніць усю прыказку ці прымаўку. Калі заданне выклікае цяжкасці, то адкрываецца па чарзе наступнае (ці папярэдняе слова). Так вучні спрабуюць аднавіць выраз.

Яшчэ адным з варыянтаў работы, з'яўляецца той, калі дзеці ўзгадваюць прыказку па двух словах. Напрыклад**:**

птушка – дзіця

Птушка рада вясне, а дзіця маці.

галава – ногі

Ад дурной галавы і нагам неспакой.

Садзейнічаюць развіццю кругагляда і фантазіі разнастайныя формы работы над, скорагаворкамі, фразеалагізмамі, якія пашыраюць лексічны запас малодшых школьнікаў, знаёмяць з багатай фальклорнай спадчынай беларускага народа, спрыяюць развіццю фанематычнага слыху, засваенню арфаэпічнага правільнага вымаўлення.

Гульня "Збярыскарагаворку"

Па дарозескарагаворкіразбіліся на дзвечасткі. Іхтрэбасабраць.

Вырасцілі Фрол і Лора	а Фрося малюеласося
Просіць Лорка Борку	загулі над грэчкайпчолы
Малюе Тамара кальмара,	выгаварыцьскарагаворку
Забялелагрэчка ў полі,	боб, фасолю, памідоры

Гульня “Адгадай фразеалагізм па малюнку і растлумач яго”

1) Кот наплакаў (мала).
2) Лётаць на крылах (быць шчаслівым).
3) Стаяць на галаве (дрэнна сябе паводзіць).
4) Сарока на хвасце прынясла (калі прыходзяць навіны).

На вучэбным занятку беларускай мовы выкарыстоўваю народныя выслоўі, прыкметы, абапіраюся на беларускі народны каляндар. У верасні знаемлю дзяцей са святам Багач, у кастрычніку – Пакрова, у лістападзе – Дзяды, у снежні – Увядзенне, у студзені – Каляды, у лютым – Масленіца, у сакавіку – Саракі, у красавіку – Благавешчанне, у маі – Вялікдзень.

Таксама развіваць фантазію вучняў дапамагаюць наступныя віды работ:

- раскрыццё сэнсу прыказак, прымавак, фразеалагізмаў.
- складанне міні-апавяданняў па прыказцы (дыялогі).

Беларускі фальклор мае вялікі выхаваўчы патэнцыял, што спрыяе фарміраванню і развіццю ў вучняў маральных якасцей: патрыятызму, дабрыні, цярплівасці, клопату пра сябра. Сістэматычная работа з прыказкамі і прымаўкамі на кожным уроку знімае напружаннасць, стомленнасць дзяцей, служыць сваеасаблівай фізкультхвілінкай. Кожны імкнецца ўспомніць больш прыказак.